# БРАВА, КАЛЕГА!

**Наш калега па Гродзенскім абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт Мікалай Іваноўскі (Ваўкавыскі раён) стаў лаўрэатам Прэміі Гродзенскага аблвыканкама імя А. І. Дубко за творчыя дасягненні ў сферы культуры і мастацтва. Урачыстая цырымонія ўручэння ўзнагарод адбылася 27 студзеня на сцэне Гродзенскага абласнога драмтэатра.**

Па традыцыі чатырнаццаць уладальнікаў творчых прафесій атрымалі Прэмію з рук старшыні Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта У. С. Караніка і ўдавы Аляксандра Дубко Эмы Нікіфараўны. Разам з узнагародай Мікалай Пятровіч Іваноўскі атрымаў тытул «Пісьменнік Гродзеншчыны 2022 года».




ДЫПЛОМ


www.grodnonews.by

У 2023-м годзе штогадовы абласны конкурс праходзіць у 25 раз. Падрабязна пра ход урачыстай цырымоніі ўзнагароджання яго пераможцаў, калі ласка, чытайце ў рэпартажы газеты «Гродзенская праўда». Фота *Таццяны Маталянец і Анатоля Апанасевіча.*




А мы ад імя нашага творчага калектыву сардэчна віншуем беларускага паэта з маленькай вёскі Пачуйкі, што на Ваўкавышчыне, Мікалая Іваноўскага з атрыманнем гэтай высокай адзнакі яго працы ў галіне мастацтва слова і шчыра жадаем Мікалаю Пятровічу моцнага здароўя, натхнення, энергіі і новых дасягненняў. Брава, шаноўны калега!

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**

**На фота:** падчас урачыстай цырымоніі ўручэння Прэміі Гродзенскага аблвыканкама імя А. І. Дубко за творчыя дасягненні ў сферы культуры і мастацтва. Гродзенскі драмтэатр, 27 студзеня 2023 года.


2023






2023




Мікалай Іваноўскі са старшынёй
ГрАА СПБ Л. А. Кебіч




З калегай, паэтам Браніславам Ермашкевічам



Паэт-лаўрэат і мастацкія вырабы




З літаратурным крытыкам Алінай Сабуць
і паэтам Аляксандрам Ганчаровым



З паэтэсай Людмілай Шаўчэнка




Паэт-лаўрэат са сваімі зямлячкамі



Паэты Мікалай Іваноўскі
і Рыгор Гармаш




2023
ДЫПЛОМ

